# ТРАДЫЦЫЙНЫЯ ГАСПАДАРЧЫЯ ПАБУДОВЫ І ПРЫЛАДЫ ПРАЦЫ Ў ВЁСЦЫ ХОЙНА ПІНСКАГА РАЁНА Ў другой палове XX – пачатку XXI стст.

**В.М. Свірыдава** (УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»)
Навуковы кіраўнік – **А.Р. Яшчанка**, канд. гіст. навук, дацэнт

Значнасць тэмы ў тым, што пры вывучэнні гаспадарчых пабудоў і прылад працы можна даведацца аб гістарычнай спадчыне беларускага народа, мінулых, даўно адышоўшых у небыццё традыцыях сялян. Некаторыя элементы традыцыйна-бытавой культуры палешукоў з пэўнай трансфармацыяй захоўваюцца ў побыце і сёння. Матэрыяльная культура Палесся вельмі багатая, мае самабытныя рысы. Апошнія яскрава праяўляюцца ў жыллі, гаспадарчых пабудовах і прыладах працы.

Мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца захаванасць традыцыйных гаспадарчых пабудоў і прылад працы Беларускага Палесся ў другой палове XX – пачатку XXI ст.ст. па матэрыялах вёскі Хойна Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Вывучэнне гэтага пытання праведзена ў 2011–2012 гг. на падставе этнаграфічнай экспедыцыі аўтара на Піншчыну і выніках уласнага назірання.

На працягу ўсяго аналізуемага перыяду ў жыхароў вёскі Хойна працягваюць існаванне гаспадарчыя пабудовы, вядомыя з часоў традыцыйнай культуры. Усе гаспадарчыя пабудовы размяшчаліся ў гумне. Адной з галоўных гаспадарчых збудаванняў сялян была клуня. Каля клуні па адзін бок быў хлявец, дзе захоўвалі зерне; па другі бок – хлеў. Не згубіла свайго значэння шопа. Мясцовыя жыхары шопу яшчэ называлі драўнікам. На Палессі бытавалі істопкі, але ў вёсцы Хойна яны зусім не сустракаюцца, падобнае памяшканне называлася камора. Выкарыстоўваліся ў гаспадарцы селяніна такія гаспадарчыя пабудовы, як свінінец, лёх. Зараз мясцовыя жыхары выкарыстоўваюць дзве назвы: лёх і пограб. Новай з'явай у жыцці сялян стала выкарыстанне куратніка. Раней курэй зімой і летам трымалі пад печчу ў хаце.

Яшчэ і сёння ў інтэр'еры дамоў старых людзей – карэнных жыхароў – можна ўбачыць куфар, дзе зберагалася адзенне сялян. Зусім знікла з выкарыстання жлукта – драўляная бочка для замачвання бялізны.

У 1950–80-ыя гг. досыць актыўна выкарыстоўваліся такія гаспадарчыя пабудовы, як клуні, хляўцы, шопы, свінінцы; з прылад працы значная роля адводзілася жлукце, ступе, жорнам, алейніцы, сенарэзцы, ручной веялцы і іншым. На мяжы XXI ст. найбольш устойлівымі былі хлявы, драўнікі, свінінцы, лёхі, земляробчыя прылады; а сустракаюцца рэдка – куфры і іншыя рэчы.

Рысы сучаснай культуры больш яскрава праяўляюцца на сумежнай тэрыторыі ў аграгарадку Жыдча Пінскага раёна.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины